УДК 069.51:398.34(476)

# ЖЫЛЛЁ Ў АБРАДАХ І ЎЯЎЛЕННЯХ БЕЛАРУСАЎ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ МУЗЕЙНЫХ АРХІВАЎ)


***А. М. Нароўская,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*



**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца semiятычныя асаблівасці традыцыйнага жылля беларусаў і сімвалічныя функцыі прадметаў яго інтэр’ера. Даецца інфармацыя пра семіятычную мадэль паселішчаў і іх межах – умоўных або маркіраваных (прыдарожнымі крыжамі, камянямі або агароджай). На падставе вывучэння матэрыялаў рукапісных фондаў Расійскага этнаграфічнага музея і Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту прыводзяцца цікавыя звесткі аб будаўнічай абраднасці беларусаў.



**Ключавыя словы:** традыцыйнае жыллё, семіётыка, этнаграфічныя экспедыцыі, абрады, звычаі.


# THE DWELLING IN RITES AND IMAGINATION OF BELARUSIANS (BASED ON MATERIALS FROM MUSEUM ARCHIVES)


***A. Narouskaya,***
*PhD in History, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Historical and Cultural Heritage of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*



**Abstract.** The article examines the semiotic features of the traditional home of Belarusians and the symbolic functions of its interior items. Information is provided about the semiotic model of settlements and their boundaries - conventional or marked (by roadside crosses, stones or a fence). Based on the study of materials from the manuscript collections of the Russian Ethnographic Museum and the Belarusian State Museum of Folk Architecture and Life, the author provides interesting information about the construction rituals of the Belarusians.



**Keywords:** traditional dwelling, semiotics, ethnographic expeditions, rites, customs.

Асноўны масіў фальклорна-этнаграфічных крыніц, якія адлюстроўваюць семіятычны статус традыцыйнага жылля і рытуальныя функцыі прадметаў яго інтэр'еру, быў зафіксаваны ў рукапісных матэрыялах Расійскага этнаграфічнага музея і Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. Архіўныя матэрыялы сталі каштоўнай крыніцай для адлюстравання традыцыйнага светапогляду карціны свету беларусаў (ў яе прасторава-часавых, сацыяльных, міфалагічна-рытуальных аспектах).

Цікавымі для выяўлення семіятычных асаблівасцей традыцыйнага жылля беларусаў з'яўляюцца экспедыцыйныя матэрыялы, якія захоўваюцца ў архіве РЭМ. У рукапісах А. К. Сержпутоўскага, Е. Р. Раманава і В. К. Косткі змяшчаюцца звесткі пра планіроўку і тыпы традыцыйнага жылля, абрады і уяўленні беларусаў, звязаных з жыллём. Так, ў справаздачы супрацоўніка Пецярбургскага Археалагічнага інстытута А. К. Сержпутоўскага адзначаецца, што «пажадана даследаваць жыллё з падрабязным апісаннем павер'яў аб выбары месца, спосабаў і тэхнікі ўзвядзення пабудовы» [3, арк. 6]. У іншай справаздачы даследчыка аб камандзіроўцы ў Мінскую губерню (1923 г.) адзначаецца, што было сабрана «больш за 600 павер'яў, прымет і забабонаў...» [6, арк. 7 адв.].

У рукапісным архіве РЭМ знойдзены матэрыялы, якія раскрываюць праблему асваення прасторы пры выбары месца для будаўніцтва новага дома, што ў першую чаргу з'яўляецца праблемай семіятычнага характару. А. К. Сержпутоўскі піша, што пры выбары месца для будаўніцтва хаты гаспадар павінен у пятніцу пасціцца, нічога не есці, не піць, а ўвечары, калі на небе з'явяцца зоркі, падмесці самому старую хату, вынесці смецце на тое месца, дзе запланавана будаваць новую хату, і легчы на смецці спаць. Тады ў сне будзе бачна, ці шчаслівае гэтае месца і якое будзе жыццё ў хаце [4, арк. 220].

Цікавымі для тэмы даследавання з'яўляюцца запісы В. К. Косткі, зробленыя ў 1905-1907 гг. Этнограф прыводзіць найбольш зручны час для пачатку будаўніцтва жылля: «Усякі гаспадар імкнецца пачаць будаўніцтва дома пад поўню з тым разлікам, што тады ў доме будзе поўна» [2, арк. 15]. Інфармацыю даследчык запісаў у час этнаграфічнай экспедыцыі ў Ігуменскі павет Мінскай губерні.

У выніку аналіза матэрыялаў А. К. Сержпутоўскага, якія ён сабраў у вёсках Мазырскага і Слуцкага паветаў Мінскай губерні, можна зрабіць выснову, што «калі ў старой хаце было ніштаватае жыццё, то і новую хату варта будаваць на ранейшым месцы, бо ад шчаслівага месца, на якім знаходзіцца хата, залежыць шчасце яго

абываценяў, пры гэтым нельга чапаць каля ўваходу і пад кутамі «хаты» дзедаўскіх камянёў, якія былі пакладзены продкамі. Камяні маюць цудадзейную сілу. Пры пабудове хаты нельга чапаць таксама падмурак печкі, бо будзе няшчасце» [4, арк. 220].

У межах традыцыйных уяўленняў у прасторы, дзе жыве чалавек, няма «нейтральных» частак: яна мае ці адмоўную, ці станоўчую характарыстыку, толькі неабходна выявіць менавіта якую. Даследчык прыводзіць звесткі, якія былі звязаны з выбарам шчаслівага месца для будаўніцтва жылля і запісаны А. К. Сержпутоўскім са слоў жыхароў Мінскай губерні [4, арк. 220]. Так, у час экспедыцыі аўтара ў в. Пагост Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобл. інфарматар Панчэня Кацярына Аляксееўна (1941 г.н.) распавяла пра мясцовыя будаўнічыя абрады «лепш было будаваць хату на бацькоўскім пляцы» [8].

Па матэрыялах А. К. Сержпутоўскага, дрэвы на пабудову хаты варта секчы «пад поўна» – перад поўняй, каб у «хаце» ўсяго было поўна, а пабудову пачынаць у маладзік (на маладзіку), каб жылося ў хаце заўсёды так весела, як у маладосці. Тыя бярвенні, у якіх валокны скручаныя супраць сонца, г.зн. з захаду на ўсход, нельга ўжываць на пабудову хаты ці хлява, бо яны прыносяць няшчасці. Такія бярвёны, заўважаныя ў старой хаце, варта неадкладна выкінуць і замяніць новымі, скручанымі па сонцы [4, арк. 222–223].

У архіўных матэрыялах РЭМ зафіксавана інфармацыя пра будаўнічыя рытуалы, звязаныя з ахвярапрынашэннямі свойскіх жывёл. Калі пры пабудове хаты выпадкова забіваецца якая-небудзь хатняя жывёла, у новай хаце будзе шчаслівае жыццё, бо бажаству ўжо прынесена крывавая ахвяра [4, арк. 221].

Аўтарам была запісана цікавая інфармацыя і аб пераходзінах («улазінах») у новы дом. Згодна звестак інфарматара Кузьміч Марыі Дзмітрыеўны, жыхаркі в. Пагост, 1944 г.н., перш чым перайсці ў новую хату «пускалі ката, які быў у хазяйстве». Па словах К. А. Панчэні, «пускалі трохмасцівага ката. А калі не было ката такой масці, то пускалі іншага, але толькі “свайго” ката, бо ён сем’янін» [8].

Асобныя моманты будаўнічых прац нярэдка суправаджаюцца адмысловымі абрадамі. Матэрыялы аб гэтым, як і тэрміналогія элементаў жылля, могуць паказваць шмат цікавага аб мінулых традыцыях беларусаў. Так, у в. Мохра Іванаўскага раёна праўнук уладара дома перадаў музею ў дар манету 1861 г., якая была закладзена на покуці «у чырвоны кут» гэтай хаты [1, арк. 49].

У архіве РЭМ выяўлена інфармацыя пра семіятычную ролю стала і рассаджванне членаў сям’і ў прасторы покуці. У запісной кніжцы са звесткамі пра паездку па Каўказе і Беларусі, А. К. Серж-

путоўскі прыводзіць такія факты: «У Беларусі, калі за стол садзяцца госці, то жанчыны не садзяцца за стол у звычайны час. Толькі на вяселлі, хрысцінах, памінках, на Дзяды і вялікія святы. А асабліва на куццю жанчыны сядзяць разам з мужчынамі…» [5, арк. 33].

Таксама ў рукапісах даследчыкаў можна знайсці інфармацыю аб семіятычнай мадэлі паселішчаў і яе межах – умоўных альбо маркіраваных прыдарожнымі крыжамі, камянямі ці агароджаю. Так, В. К. Костка адзначае, што «пры злучэнні «вулачкі» з «вуліцай» заўсёды ставілі крыж» [2, арк. 10].

У рукапісных матэрыялах А. К. Сержпутоўскага адзначаецца, што крыж звычайна ставіцца ў такіх месцах, якія лічуцца святымі, г. зн. там, дзе потым часам будуюць капліччкі. Не толькі на Палессі, але і па ўсёй Беларусі крыжы трапляюцца вельмі часта. Яны стаяць на вуліцах пры дарогах, асабліва на «ростанцах» (месца, дзе разыходзяцца дзве дарогі) і скрыжаваннях, па берагах рэк і азёр, на ўзгорках каля крыніц і г.д. [4, арк. 68].

Прадметы побыту ў традыцыйным жыллі выконвалі не толькі практычную, але і сімвалічную функцыю. Так, пячное начынне разглядалася беларусамі як магічны сродак у барацьбе з «нябеснай вадой». У час этнаграфічнай экспедыцыі БДМНАП была запісана інфармацыя ад А. Е. Красакова (жыхара в. Аляксандраўка Кармянскага раёна Гомельскай вобласці, 1904 г.н.) пра тое, што «каб град скончыўся, выкідалі з хаты крыж накрыж хлебную лапату і памяло». У в. Кіраў Нараўлянскага раёна Гомельскай вобласці, каб спыніць моцны дождж, адчынялі комін [7].

Аналагічная інфармацыя была зафіксіравана ў рукапісным архіве РЭМ: «падчас навальніцы і граду выносяць з хаты хлебную лапату, пакрываюць яе «надзежнікам». Калі навальніца і град не спыняюцца выносяць «віэка» – вечка дзяжы, на яго кладуць «надзежнік», абраз Св. Мікалая цудатворца, асвячоную вярбу, «хрэшчык» (хлебны крыжык, выраблены ў сераду на чацвёртым тыдні Вялікага паста), асвечаны на Юр'я (23/IX), зерне, грамнічную свечку, асвечаную на Грамніцы (2/II)» [4, арк. 195].

Такім чынам, традыцыйнае жыллё з'яўляецца адным з архетыпічных вобразаў у свядомасці чалавека, які дае нам ідэальныя ўяўленні аб Сусвеце і найбольш значных цыклах жыцця. У рукапісных архівах Расійскага этнаграфічнага музея і Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту назапашаны разнастайны матэрыял па будаўнічай абраднасці, і абрадах, звязаных з прадметамі інтэр'ера традыцыйнага жылля беларусаў. Даследаванне архіўных матэрыялаў дапамагло выявіць сістэму абме-

жаванняў пры будаўніцтве жылля, спецыфіку выкарыстання адпаведнага будаўнічага матэрыялу і вызначэння месца і часу будаўніцтва. Выкананне ўсіх правілаў з'яўлялася залогам дабрабыту сям'і ў будучым доме.


*1.* Архіў Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. – Справаздачы аб навуковых камандзіроўках па РБ (14.01 – 27.05.1978). – Справаздача аб камандзіроўках ў Брэсцкую вобласць Пінскі, Іванаўскі і Столінскі раёны (27.03 – 01.04.1978 г.).

*2.* Архіў Расійскага этнаграфічнага музея. – Ф. 1. Воп. 2. Спр. 352. Арк. 15. – В. К. Костка. Сялянскае жыллё Ігуменскага павета Мінскай губ. 1905–1907 гг.

*3.* Архіў Расійскага этнаграфічнага музея. – Ф. 1. Воп. 2. Спр. 573. – Перапіска і справаздача супрацоўніка Пецярбургскага Археалагічнага інстытута А. К. Сержпутоўскага аб збіранні этнаграфічных матэрыялаў у Беларусі.

*4.* Архіў Расійскага этнаграфічнага музея. – Ф.1. Воп. 2. Спр. 574. Арк. 3. – Апісанне А. К. Сержпутоўскага аб пабудовах, занятках і павер'ях сялян Мазырскага і Слуцкага паветаў Мінскай губ. (Рукапісы, чарцяжы і малюнкі).

*5.* Архіў Расійскага этнаграфічнага музея. Ф. 1. Воп. 2. Спр. 580 а. Арк. 33. Сержпутоўскі А. К. Нататнікі паездак па Каўказе і Беларусі. 1911 г. Арк. 33.

*6.* Архіў Расійскага этнаграфічнага музея Ф. 1. Воп. 2. Спр. 583. – Справаздача Сержпутоўскага А. К. ад 3 лістапада 1923 г. у Мінскую губ. Слуцкі павет.

*7.* Асабісты архіў аўтара: матэрыялы экспедыцыі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту ў Нараўлянскі раён Гомельскай вобласці (1981 г.).

*8.* Асабісты архіў аўтара: экспедыцыя ў Жыткавіцкі раён Гомельскай вобласці (2022 г.).